# Пісьмо тав. ГІКАЛО піонерам і школьнікам

## ДАРАГІЯ РЭБЯТЫ, ПІОНЕРЫ І ШКОЛЬНІКІ!

Вельмі важную, цікавую, патрэбную справу робіце вы, прымаючы ўдзел у абвешчаным ЦК комсамола і Наркомасветы краязнаўчым паходзе па вывучэнню багацця́ў, дастапрымячальнасцей нашай ордэнаноснай рэспублікі.

Пад кіраўніцтвам вялікай партыі большэвікоў на чале з любімым правадыром таварышом **Сталіным** Совецкая Беларусь—неадлучная частка Совецкага Саюза — стала квітнеючай рэспублікай.

Уважліва азнаямляйцеся з яе гісторыяй, вывучайце кожны гістарычны, рэволюцыйны помнік, любоўна ахоўвайце магілы слаўных чырвоных герояў, загінуўшых у барацьбе супроць белапольскіх і нямецкіх акупантаў.

Збірайце і запісвайце вусную народную творчасць, якая з'яўляецца выдатным праяўленнем народнай мудрасці і адлюстраваннем дум і спадзяванняў працоўных на працягу вельмі многіх гадоў.

Праводзьце ўсю гэту работу пад кіраўніцтвам вашых важатых і пры дапамозе настаўнікаў, навуковых работнікаў, спецыялістаў, чырвоных партызан, баявых камандзіраў.

Я ўпэўнен, што, спалучаючы адпачынак у піонерскіх лагерах, на пляцоўках, фарпастах, з удзелам у краязнаўчым паходзе, вы прыдзеце ў школу адпачыўшымі, загарэўшымі і разам з тэтым прынясеце каштоўныя знаходак, выкапняў, насення раслін, з якіх вы складзеце свае школьныя музеі.

Жадаю вам добра і з карысцю правесці летнія канікулы.

З комуністычным прывітаннем.

**Ваш Н. ГІКАЛО.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ